# СІНТАКСІЧНА НЕПАДЗЕЛЬНЫЯ СЛОВАЗЛУЧЭННІ Ў СТАРАБЕЛАРУСКАЙ МОВЕ (*НА МАТЭРЫЯЛЕ «ГІСТАРЫЧНАГА СЛОЎНІКА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ»*)

*Н. Ю. Перавалава (Мінск, Беларусь)*

У артыкуле разглядаюцца сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў помніках старабеларускага пісьменства. Словазлучэнні гэтага тыпу прадстаўлены спалучэннямі лічэбніка з назоўнікам, лічэбніка з назоўнікам у родным склоне з прыназоўнікам *з*, займенніка з назоўнікам, займеннікам у родным склоне з прыназоўнікам *з*, няпэўнага займенніка з прыметнікам, азначальным займеннікам, азначальнага займенніка *сам* з назоўнікам, інфінітыва з дзеясловамі.

***Ключавыя словы:*** словазлучэнне; кампаненты; сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні; назоўнік; лічэбнік; займеннік; дзеяслоў; прыназоўнік; слоўнік.

Словазлучэнне – свабоднае сэнсавае і фармальнае аб'яднанне двух (або болей) паўназначных слоў, звязаных падпарадкавальнымі адносінамі. У беларускім мовазнаўстве словазлучэнні апісваюцца на аснове наступных характарыстык.

1. Паводле віду сувязі паміж кампанентамі непрэдыкатыўныя словазлучэнні падзяляюцца на паратаксічныя і гіпатаксічныя.

2. У залежнасці ад характару сувязі паміж кампанентамі словазлучэнні дзеляцца на свабодныя, у якіх кожны кампанент захоўвае сваё самастойнае значэнне і з'яўляецца асобным членам сказа і несвабодныя, у якіх пэўныя кампаненты аслабілі сваё лексічнае значэнне і выступаюць у ролі аднаго члена сказа, утвараючы непадзельнае сінтаксічнае адзінства.

3. Па структуры вылучаюцца словазлучэнні простыя і складаныя. Простыя словазлучэнні складаюцца, як правіла, з двух самастойных слоў, але можа быць і большая колькасць слоў

4. Паводле сэнсава-граматычных адносін паміж кампанентамі сярод гіпатаксічных словазлучэнняў вылучаюцца: 1) словазлучэнні з аб'ектнымі адносінамі; 2) словазлучэнні з атрыбутыўнымі адносінамі; 3) словазлучэнні з акалічнаснымі (сітуацыйнымі) адносінамі, такімі як прычынныя, колькасныя, прасторавыя, часавыя і г.д.

Сярод паратаксічных словазлучэнняў з незамкнутым радам кампанентаў вылучаюцца: 1) словазлучэнні са спалучальнымі адносінамі (калі паказваецца адначасовасць, сумеснасць або паслядоўнасць прадметаў, дзеянняў, з'яў); 2) словазлучэнні з размеркавальнымі адносінамі (калі паказваецца чаргаванне або ўзаемнае выключэнне прадметаў і з'яў).

5. Паводле разнавіднасцей сінтаксічнай сувязі паміж кампанентамі сярод гіпатаксічных словазлучэнняў вылучаюцца словазлучэнні з дапасаваннем, кіраваннем і прымыканнем.

6. Паводле парадку кампанентаў. У паратаксічных словазлучэннях парадак кампанентаў, як правіла, свабодны, за выключэннем дзеяслоўных словазлучэнняў з адносінамі паслядоўнасці. У гіпатаксічных словазлучэннях, дзе кампаненты не раўназначныя, іх парадак больш устойлівы.

Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні вельмі пашыраны ў беларускай мове. У адрозненне ад свабодных словазлучэнняў – гэта два і больш самастойныя словы, якія цесна звязаны паміж сабой і выконваюць ролю аднаго члена сказа. Як і свабодныя словазлучэнні, сінтаксічна непадзельныя будуюцца па той самай структурнай схеме, а кампаненты ў іх звязваюцца паводле падпарадкавальнай сувязі. Для сінтаксічна непадзельных словазлучэнняў не характэрна такая семантычная спаянасць слоў-кампанентаў, а таксама ўзнаўляльнасць, як у фразеалагічных словазлучэннях. Паміж кампанентамі ўзнікаюць камплетыўныя семантыка-сінтаксічныя адносіны, у выпадку якіх залежнае слова папаўняе недахоп інфармацыі, заключанай у галоўным кампаненце.

Крыніцай фактычнага матэрыялу для разгляду сінтаксічна непадзельных словазлучэнняў у помніках старабеларускай пісьменнасці стаў «Гістарычны слоўнік беларускай мовы» – першы і пакуль адзіны ў беларускай лексікаграфіі даведнік, у якім максімальна поўна даецца тлумачэнне і граматычная характарыстыка лексікі старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы. Слоўнік выходзіў з 1982 па 2017 г. Крыніцамі фактычнага матэрыялу сталі помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці XIV–XVIII стст. Гэты прамежак часу дакладна вызначаецца агульнай перыядызацыяй гісторыі беларускай мовы. Рубеж XVIII ст. аддзяляе старажытную беларускую літаратурна-пісьмовую мову ад новай. У 37 выпусках слоўніка лексікаграфічную апрацоўку атрымалі звыш за 75 тысяч слоў, якія прадстаўлены ў помніках старабеларускай пісьменнасці розных жанраў. Усяго ж картатэка налічвае 1 мільён 60 тысяч картак.

Выяўлены наступныя віды сінтаксічна непадзельных словазлучэнняў:

1. лічэбніка з назоўнікам: тежъ естли бы хто какъ на школу жидовскую литалъ, тотъ маетъ старостѣ нашому заплатити **два фунта** перцу (АЗР, I, 24, 1388), а хто **двȣ лѣт** жеребѧ забьет то **шесть гривенъ** маеть платить (Вісл., 36 б), и ехал з хвалою до птоломаиды: и зъехалсе там **з двома царями** (Кн Мак., 60), **двои пчолъ** у соснах бортных подданого его… со пчолами выдрал и мед побрал (АВК, XXXVI, 284, 1582), сума того **одиннадцать копъ** безъ **петинадцати грошей** (АЮЗР, I, 16), келбасъ **колецъ одинадцать** за злотый и **асмаковъ одинадцать** (ИЮМ, I, 218, 1682);

2. лічэбніка з назоўнікам у родным склоне з прыназоўнікам *з*: Рек Трыщан: **ѡдному з нас** проч поити у тоеи лодьи, а другому тут ѡстати (Трыст., 20), **котораꙗ з трех** тых богин ȣдꙗчнѣ$^{s}$шою есть, тое ꙗблоко оно$^{s}$ неха$^{s}$ бȣде (Тр. Гіст., 67 б), шедши пристал$^{s}$ до **одного з$^{s}$ обывателевъ** стороны тои, который его послалъ на село свое пасти свиній (Каліст., I, 9), ꙗко ѡ томъ надобне, **ѡдинъ з$^{s}$ докторовъ** црковныхъ,… в тые слова мовитъ (Карп., 15), до оной [обмовы] подпису **жадного з** тых **татар**, которых припозвано, немашъ (АВК, XXXI, 478);

3. займенніка з назоўнікам, займеннікам у родным склоне з прыназоўнікам *з*: **нѣкоторыи зъ нашихъ** пановъ, коли то на валцѣ, если имъ мѣстцо дано будетъ, а они того мhстца не смотрятъ (Вісл., 2), одно такъже въ свое$^{s}$ власно$^{s}$ речы **кождому з нихъ** вольно бȣдеть ȣ права мовити (Ст., 1588, 214);

4. няпэўнага займенніка з прыметнікам, азначальным займеннікам: але, яко видимъ, делаѣтъ то **хтось инный**, зычучи, штобъ якавякольвекъ искра огня до запалу нелюбови и ссоры въ сердцу вашого царского величества зоставала (АЗР, V, 25, 1637);

5. азначальнага займенніка *сам* з назоўнікам: с того домȣ **самъ пан** кривдȣ кому ȣчинил (Ст. 1588, 116), **сама злость** строфуетъ злосливого и осуждаетъ (Каліст., I, 14 б), знову его навѣдил **корол сам** (Зб., 107, 169);

6. інфінітыва з дзеясловамі, якія:

1) абазначаюць пачатак, працяг або канец дзеяння: поиде… витовтъ къ граду вилни… и **почѧ добывати** кривого города (Віл., 447), назавтрэе в понеделокъ **почънутъ… судити** (Ст. 1566, 52 б), Костенътинъ, наехавъши ночъю з людъми, и **почалъ** Зенка **имати**, и хотелъ его згубити (КЗ, 470, 1448);

2) выражаюць мадальна-валявыя адцэнні: Позналъ, мовитѕ, волъ властелѧ своего, и оселъ ꙗсли пана своего. **Хочешъ ведати**, же сѧ и птахѡвъ безрозȣмѣйшими найдȣемо (Каліст., I, 152), они же чинѧчи некоторыи дивы **хотели бы ѡтвести** людей ѡт гсда бога (Скар., ДЗ, 29), Костенътинъ, наехавъши ночъю з людъми, и почалъ Зенка имати, и **хотелъ** его **згубити** (КЗ, 470, 1448);

7. інфінітыва з прыметнікам, безасабова-прэдыкатыўным словам: сȣдъ и милосердье и веру. лечъ тое **потребно чинити**, а оныхъ не оставляти (Цяп., 32 б), **рад се напивати** кгаѕдашъ не помалу але и дужо скакати (Зб. 107, 128 б), ѡчи мои **рады видѣти** вѣрных на земли, абы седѣли со мною (Пс. XVII, 104).

Пералічаныя віды сінтаксічна непадзельных словазлучэнняў паказваюць, што ў помніках старабеларускага пісьменства розных жанраў гэты тып сінтаксічных канструкцый ужываўся шырока. Такія словазлучэнні выконвалі ролю аднаго члена сказа.

***Бібліяграфічны спіс***

1. Гістарычны слоўнік беларускай мовы: у 37 вып. / НАН Беларусі, Ін-т мовазнаўства; пад. рэд. А. М. Булыкі. – Мінск : Беларус. навука, 1982–2017.

# АБ КРЫНІЦАХ ПАРАЎНАЛЬНАГА ВЫВУЧЭННЯ ЛЕКСІКІ СТАРАБЕЛАРУСКАЙ І СТАРАРУСКАЙ МОЎ

*Н. В. Паляшчук (Мінск, Беларусь)*

Наяўныя ў беларускім дыяхранічным мовазнаўстве гісторыка-лінгвістычныя даведнікі, у першую чаргу фундаментальны «Гістарычны слоўнік беларускай мовы» ў 37 выпусках (1982–2017 гг.), з'яўляюцца надзейнымі крыніцамі фактычнага матэрыялу для правядзення разнапланавых лексікалагічных даследаванняў, у тым ліку і для параўнальнага вывучэння беларускай і рускай моў XIV–XVIII стст. (з прыцягненнем адпаведных рускіх слоўнікаў).

***Ключавыя словы:*** гістарычная лексікалогія; гістарычная лексікаграфія; гістарычны слоўнік; старабеларуская мова; стараруская мова.

Кола актуальных задач параўнальнага вывучэння беларускай і рускай моў XIV–XVIII стст. звязана з вызначэннем і сістэматызацыяй у іх слоўным